CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

**KOD** | **PESEL**

***Miejsce na naklejkę.***
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# Egzamin maturalny *Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Symbol arkusza*
MMBB-R0-100-2605

DATA: **15 maja 2026 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **35**

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

1. Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
2. Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
3. Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 14 stron.
   Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie arkusza oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
4. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
5. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
6. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
7. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
8. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
9. Możesz korzystać ze słownika języka białoruskiego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2025/2026**

**Zakres podstawowy**
Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Біблії*;
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*;
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы*; *Мужыцкая праўда №1*;
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*;
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай*; *Калыханка*, *выбраныя вершы*;
Змітрок Бядуля, *На каляды к сыну*; *Пяць лыжак заціркі*;
Цётка, *Шануйце роднае слова*;
Максім Багдановіч, *Апокрыф*; *Хто мы такія*; *Санет*, выбраныя вершы;
Максім Гарэцкі, *Рускі*; *Стары прафесар*;
Янка Купала, *Курган*; *Незалежнасць*, *Явар і каліна*, *Спадчына*, выбраныя вершы;
Якуб Колас, *Новая зямля*, *Што яны страцілі*;
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*;
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы;
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская*, выбраныя вершы;
Янка Брыль, *Галя*, *Маці*;
Ян Скрыган, *Слепата*;
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*;
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўство*);
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі*, *Дарога праз лес*;
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*); *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы;
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*;
Сакрат Яновіч, *Гасцінец*, *Прыгожай*, *Бацькаў гнеў*, *Вёха – багіня ганьбы*;
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві...*, выбраныя вершы;
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай);
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*;
Алесь Барскі, *Беластоцкі край*; *Я сын зямлі беластоцкай...*, *Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы;
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*);
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1 раздзела часткі другой).

**Zakres rozszerzony**
Максім Багдановіч, *За сто лет*;
Максім Гарэцкі, *Фантазія*;
Якуб Колас, *У палескай глушы* (фрагмент *XVI часткі)*;
Янка Купала, *Тутэйшыя*;
Рыгор Барадулін, *Жыццё і паэзія*;
Сакрат Яновіч, *Пад знакам Арла й Пагоні* (фрагмент *30. Эліты)*;
Ларыса Геніюш, *Споведзь*;
Надзея Артымовіч, *Ёсць тое...*, выбраныя вершы;
Алесь Разанаў, *Sumus ne simus*, выбраныя вершы;
Вольга Рымша, *Рэквіем*;
Уладзімір Арлоў, *Незалежнасць – гэта...*;
Барыс Пятровіч, *Трызненні* (фрагмент *Шчасце быць – 1).*

**Выберы адну з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.**

- Твая праца павінна складацца не менш чым з **350 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.
- Сачыненне напішы па-беларуску.

Тэма 1. (0–35)
**Жыццё як дарога. Зрабі параўнальную інтэрпрэтацыю прыведзеных ніжэй вершаў Алеся Разанава і Уладзіміра Караткевіча.**

Алесь Разанаў
***На гэтай зямлі***

Хто пытаецца ў мяне дарогу на ўсход,
хто – дарогу на захад...

Нібы раздарожжа, я паказваю ўсім, куды
ісці, а сам застаюся на месцы –
на гэтай зямлі, пад гэтым небам,

занадта лёгкі для глыбіні,
занадта цяжкі для вышыні,
занадта цэласны, каб падавацца
ў які-небудзь бок...

Вось мая левая рука, вось – правая...
Я кладу зерне ў дол – і яно вырастае
ў дрэва:

на адной галіне ў яго сонца,
на другой – месяц,
рознагалосыя птушкі з усіх канцоў свету
спяваюць на ім свае песні і ладзяць
гнёзды...

Тут мой захад, і тут – усход.

www.dziejaslou.by

Уладзімір Караткевіч
***Дарогі ўсёй зямлі маёй...***

Дарогі ўсёй зямлі маёй
Гудуць у стомленых нагах.
Куды табе ісці за мной
У гэткі невыносны шлях?

Выццё здалёк. Бяжыць руя,
І вочы свецяцца ваўкоў,

Такіх жа валацуг, як я,
Маіх сяброў, маіх братоў.

І, можа, тыя, што ў мане
Жывуць свой век, п’юць добрых кроў,
Цкаванне ўладзяць на мяне
Калісьці – горш, чым на звяроў.

Ўзяць не магу цябе я ў бой,
Аддаць марозу і агню,
Аддзячыць ліхам за любоў,
Нянавісцю – за дабрыню.

Не плач над лёсамі звяроў
І вей не апускай разбег,
Як крумкачынае пяро
На белы-белы, чысты снег.

Дарогі ўсёй зямлі маёй
Гудуць у стомленых нагах.
Куды табе ісці за мной
У гэткі невыносны шлях.

www.knihi.com

Тэма 2. (0–35)

**Якую місію мае, калі ўвогуле мае, паэт? Паразважай над пытаннем. У сваёй аргументацыі выкарыстай прыведзенае эсэ Надзеі Артымовіч, а таксама два выбраныя творы беларускай літаратуры.**

Надзея Артымовіч

***Паэзія – гэта вольнасць***

Паэзія – гэта падарожжа. У глыб сябе. Пяро паэта – скальпель, які спрабуе дакладна зняць першую скуру паэта. Але ніводзін скальпель не з’яўляецца дасканалай прыладай. Гладкая скура з цяжкасцю паддаецца зняццю. Даходзіць часам да цяжкіх калецтваў, парэзаў і ран, якія вельмі марудна гояцца. Ніякіх лекаў ты не можаш ужыць, таму што калецтвы павінны прывесці да самавыздараўлення. Але працэс самавыздараўлення часта ачышчае скуру паэта ад паэзіятворчых бактэрый.

Паэзія – гэта вольнасць. Паэзія нараджаецца ў самотнасці. Паэзія – гэта ўцёкі ад самотнасці і адначасна доўгае падарожжа да самотнасці. Кожная самотнасць вялікая.

Паэзія – музыка з дакладнай партытуры. Часта стаўлю сабе пытанне – ці не фальшую ўласную партытуру, што ўпісана ўва мне. Ці пераказваю хоць бы асноўныя ноты гэтай партытуры?

Сапраўдная паэзія – інтэлектуальная (і не толькі інтэлектуальная) правакацыя. Правакуе прыгожае. Чаму так мала людзей цягнецца да вершаў? Чалавек не любіць быць справакаваным. Сапраўдная паэзія (мастацтва) змушае чытача да адмаўлення ад беззаганнага самавобраза, заснаванага на гэтак званай жыццёвай філасофіі. Таму,

напрыклад, творы Роберта Музіля ставяць чытача ў вельмі складаныя і нязручныя сітуацыі.

Сапраўдны паэт павінен быць вельмі моцна ўключаны ў чалавечую какафонію, але адначасна павінен стаяць па-за рэчаіснасцю.

Паэзія – гэта музыка, гэта прыгожае. Яна называе, замацоўвае свой час. А гэта і ёсць прыгожае. У творчасці паэта ёсць адзін важны верш. Усе астатнія вершы з'яўляюцца фонам, ценем, у якім паэт схаваны. Не заўсёды творца ўсведамляе значэнне тых схованак.

Сапраўдная паэзія – гармонія. Гармонія, дасканаласць. І таму так цяжка паддаецца аналізу і ці гэта магчымае? На якім слове пачынаецца верш, на якім слове верш скончыцца? Пра гэта ведае толькі паэт (аўтар). Але гэта не выключае іншых варыянтаў прачытання вершаў чытачамі. Аўтарскія лагічныя акцэнты ў вершы глыбока прыхаваны.

Напісанне аўтарам гэтак званай творчай біяграфіі дае няшмат або нічога не дае для высвятлення найважнейшых аспектаў яго творчасці. У гэтым пытанні нічога нельга растлумачыць, высветліць.

У сваёй паэзіі спрабую пераказаць уласную іерархію вартасцяў, не заўсёды наўпрост. Імкнуся гэта зрабіць празрыстым, ясным, простым спосабам.

Паэзія не толькі тое, што напісана. Жыццё таксама бывае паэзіяй...

Н. Артымовіч, *Жоўтая музыка*, Беласток 2005, с. 48–49.

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr** 

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
| --- | --- | --- |

**<u>Tabele wypełnia egzaminator!</u>**

| | | | | *Jeżeli **0 pkt** – wskaż powód.* | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | **0** | **1** | *Brak lektury obowiązkowej.* | *Nie dotyczy problemu.* | *Nie jest wypowiedzią argumentacyjną.* |

| | | | | | | | | | | | | *Liczba błędów rzeczowych* | ***OGÓŁEM KLiK*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | | |
| | | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **3a** | **Struktura wypowiedzi** | **0** | **1** | **2** | **3** |
| | | G | F E | C D | B |

| | | *Liczba błędów w spójności* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **3b** | **Spójność wypowiedzi** | | **0** | **1** | **2** | **3** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **3c** | **Styl wypowiedzi** | **0** | **1** |

| | | *Liczba błędów językowych* | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4a** | **Zakres i poprawność środków językowych** | | **0** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** |
| | | | 3H 3G 3F 2H 2G 1H | 3E 2F 1G | 3D 2E 1F | 3C 2D 1E | 3B 2C 1D | 3A 2B 1C | 2A | 1B |

| | | *Liczba błędów ortograficznych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4b** | **Poprawność ortograficzna** | | **0** | **1** | **2** |

| | | *Liczba błędów interpunkcyjnych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4c** | **Poprawność interpunkcyjna** | | **0** | **1** | **2** |

**Łączna liczba punktów: ……………………**

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Formuła 2023*


# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom rozszerzony

*Formuła 2023*